КАНТАКТ
№ 2 (42)
Спецпраект газеты «Звязда» сумесна з РУП «Белпошта» і РУП «Белсаюздрук»



■ Філатэлія

# МІНІЯЦЮРЫ З СУСЛІКАМ І БУСЛОМ

## Самыя папулярныя маркі ў калекцыянераў — з выявамі жывёл і раслін

**Беларускія маркі зноў прызналі аднымі з найлепшых у свеце. На Азіяцкай міжнароднай філатэлістычнай выставе «CHINA 2016» наша экспазіцыя ўдзельнічала ў 14-м міжнародным конкурсным класе і была ўзнагароджана сярэбраным медалём. Прыз прысудзілі паштовай прадукцыі, выпушчанай з 2013 па 2015 год. Чым адметная беларуская філатэлія? Пра гэта мы даведаліся ў начальніка выдавецкага цэнтра «Марка» прадпрыемства «Белпошта» Ірыны ШЫПІЛАВАЙ.**

### У форме трохвугольніка

Крыху гісторыі. Першая ў свеце дзяржаўная марка была выпушчана ў Вялікабрытаніі 6 мая 1840 года. Яе назвалі «Чорны пені» праз колер друку і кошт у адзін пені. Роданачальнікам маркі лічаць сельскага настаўніка Роўленда Хіла, які пазней стаў каралеўскім генеральным паштмайстрам.

Гісторыя беларускай філатэліі пачынаецца з 20 сакавіка 1992 года. У той дзень была выпушчана ў абарачэнне першая айчынная паштовая мініяцюра «Крыж Еўфрасінні Полацкай». Спачатку маркі тыражаваліся ў Расіі, а з 1995 года вытворчасць дзяржаўных знакаў паштовай аплаты наладжана ў Беларусі. Маркі надрукавалі ў выдавецтве «Беларускі Дом друку»: яны выйшлі ў абарачэнне 4 мая 1995 года і былі прысвечаны 50-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

На сёння ўведзена амаль 1200 беларускіх марак. Штогод выпускаецца каля 50 сюжэтаў мастацкіх паштовых мініяцюр. На іх адлюстраваны сучасныя рэаліі дзяржавы, гістарычная і культурная спадчына, багатыя флора і фаўна.

**Кніга «Паштовыя маркі Рэспублікі Беларусь. 2015» стала дыпламантам нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі», які праводзіўся ў рамках XXIV Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу.**




Паштовы блок з Дар'яй Домрачавай быў прызнаны найлепшай маркай 2014 года.

— Апошнія гады выдавецкі цэнтр «Марка» працуе па некалькіх кірунках, — расказвае Ірына Шыпілава. — З аднаго боку, павышаюцца патрабаванні да распрацоўкі арыгінал-макетаў марак і іх вырабу. З другога — аптымізаваны формы выпуску: зроблены ўхіл на «зручныя» памеры марачных лістоў, прадугледжана наяўнасць купонаў і па-мастацку аформленых палёў. Беларускія маркі сталі «больш прыбранымі». Пры іх вырабе прымяняюцца паслядрукарскія паліграфічныя тэхналогіі: выбарачная лакіроўка, тэрмічнае цісненне металізаванай фольгай і іншыя. З'явіліся незвычайныя паштовыя маркі — у выглядзе трохвугольніка, круга, авала. Безумоўна, гэта вялікі крок наперад.

### Экспарт у 60 краін

— Улічваючы багатую тэматыку выпускаў і высокае паліграфічнае выкананне, можна з упэўненасцю сказаць, што беларускія маркі цікавыя айчынным і замежным калекцыянерам. Адгрузка нашага філатэлістычнага матэрыялу на экспарт ажыццяўляецца ў 60 краін, — адзначае Ірына Шыпілава.

Найбольш папулярная і запатрабаваная тэма ў сусветнай філатэліі — флора і фаўна. Прыкладна трація беларускіх марак прысвечана гэтай тэме. На паштовых мініяцюрах шырока прадстаўлена тэма запаведных тэрыторый. На марках розных гадоў паказаны Бярэзінскі біясферны запаведнік, Белавежская і Налібоцкая пушчы, Нацыянальныя паркі «Прыпяцкі», «Нарачанскі», «Браслаўскія азёры».

Раз на пяць гадоў беларуская пошта атрымлівае дазвол на выкарыстанне лагатыпа Сусветнага фонду прыроды (WWF) на марках з адным з рэдкіх відаў фаўны краіны. У супрацоўніцтве з гэтым фондам былі выдадзены серыі, прысвечаныя еўрапейскаму бабру, еўрапейскай рысі, чорнаму буслу і рагатаму дзеду (від стракоз). У 2015-м пад эгідай WWF выпусцілі маркі серыі «Рабы суслік».

Штогод выходзіць мастацкая паштовая мініяцюра «Птушка года Беларусі». Маркі гэтай серыі маюць свой стыль: яны выдаюцца невялікімі марачнымі лістамі з купонамі і мастацкім афармленнем палёў у дадатак. Традыцыйна да кожнага выпуску вырабляецца паштовая картка для картмаксімуму (на пярэднім баку такой карткі наклеена марка таго ж малюнка і стаіць штэмпель). Летась на мініяцюры быў намаляваны гогаль звычайны.

— Беларуская пошта ўлічвае інтарэсы калекцыянераў і выпускае шырокі спектр філатэлістычнай прадукцыі. Гэта канверты Першага дня, спецыяльныя памятныя гашэнні, картмаксімумы рознай тэматыкі. Арганізаваны выраб тэматычных і гадавых набораў, буклетаў і іншых паштовых сувеніраў, — расказвае Ірына Шыпілава. — Трэба адзначыць, што маркі, будучы калекцыйным матэрыялам, не толькі не губляюць з гадамі сваёй матэрыяльнай каштоўнасці, а наадварот, набываюць яе. Выпушчаныя пэўным тыражом, яны раскупляюцца, колькасць іх у продажы пастаянна змяншаецца, а попыт павялічваецца.

### Водгук і ідэі кліентаў

Вызначыць найлепшую сярод беларускіх марак, выпушчаных летась, можа любы ахвотны. Конкурс-апытанне праходзіць з 20 лютага па 20 сакавіка. Анкету можна запоўніць на сайце Белпошты або ў любым аддзяленні сувязі краіны.

Сярод пераможцаў мінулых гадоў — паштовыя блокі «1025-годдзе Хрышчэння Русі», «Дар'я Домрачава — трохразовая алімпійская чэмпіёнка XXII зімовых Гульняў у Сочы (біятлон). Герой Беларусі», «70 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне».

— Мы заўважылі наступную тэндэнцыю: найлепшымі выпускамі становяцца паштовыя блокі. Але гэта хутчэй тэхнічная асаблівасць, бо блок складаецца з маркі і мастацкага поля, а таму змяшчае больш ілюстраванага матэрыялу, — кажа Ірына Шыпілава. — Штогадовы конкурс — гэта ўнікальная магчымасць атрымаць зваротную сувязь ад пакупнікоў. Кожнае пажаданне ці заўвага не застаецца без увагі. У выніку посткросеры падказалі шмат ідэй для мастацкіх картак і паштовых марак.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

### Служым закону, народу, айчыне

**Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь 24 лютага выпускае ў абарачэнне паштовы блок, прысвечаны 100-годдзю беларускай міліцыі, бо менавіта ў далёкім 1917-м, 4 сакавіка, грамадзянскі камендант Мінска падпісаў загад, згодна з якім М.В. Фрунзэ прызначаўся часовым начальнікам міліцыі Усерасійскага земскага саюза па ахове парадку ў горадзе... Праект падрыхтаваны ў супрацоўніцтве з Міністэрствам унутраных спраў. Дызайн Таццяны Кузняцовай. У дзень выпуску паштовага блока ў аддзяленні сувязі №1 Мінска (крама «Філатэлія»), вул. Маскоўская, 16) будзе праводзіцца спецыяльнае гашэнне на канверце.**




# Вясенні настрой ад паштавікоў

**Стала добрай традыцыяй у Мінскім філіяле Белпошты напярэдадні свят ладзіць разнастайныя акцыі для кліентаў. Напрыклад, у аддзяленнях паштовай сувязі Барысаў-5 па вуліцы Працы, 5, Дзяржынск-2 (вуліца Талстога, 4), Слуцк-9 (вуліца М. Багдановіча, 2), Салігорск-7 (вуліца Казлова, 31) пры набыцці 6 сакавіка прадукцыі на пэўную суму кліент атрымае ў падарунак дзве віншавальныя паштоўкі.**

— Гэтае прома-мерапрыемства мы назвалі «Вясенні настрой». Яно стане добрай нагодай павіншаваць родных і блізкіх са святам, знамянальнай падзеяй у іх жыцці, напісаць на паштоўках у іх адрас цёплыя і пяшчотныя словы. Падчас мерапрыемства спецыялісты раскажуць кліентам аб магчымасцях перасылкі адпраўленняў паскоранай поштай EMS Belpost, — растлумачыла **начальнік аддзела маркетынгу і прасоўвання паслуг філіяла Валянціна ЕСІПОВІЧ.**

Акрамя таго, прапануецца акцыя і ад паштовага інтэрнэт-магазіна «Перасылка — у падарунак!». Толькі 1 сакавіка пры афармленні заказу на любую суму наведвальнік атрымае 100-працэнтную зніжку на яго перасылку да аддзялення паштовай сувязі па месцы жыхарства.

— Заўсёды даступная і актуальная інфармацыя з лепшымі цанавымі прапановамі ёсць у раздзелах: зніжкі, навінкі і хіты продажу. Аформіць заказ можна ў любым аддзяленні Белпошты, на сайце shop.belpost.by або па тэлефоне 8017 220-56-32 з дастаўкай па ўсёй краіне. Аплаціць тавар можна рознымі спосабамі: банкаўскай карткай, карткай растэрміноўкі «Халва», пры афармленні заказу ў аддзяленні паштовай сувязі або пры атрыманні — гатоўкай, — запрашае Валянціна Есіповіч.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

# Самы знакаміты адрасат

**Гродзенскі філіял Белпошты сёлета парадаваў і яшчэ парадуе жыхароў новых мікрараёнаў. Нядаўна адбылося наваселле паштовага аддзялення ў Астраўцы па вуліцы Уладзіміра Караткевіча. Горад будучых атамшчыкаў пастаянна расце, будуецца жыллё, інфраструктура, таму чарговы паштовы аб'ект асабліва актуальны для новага мікрараёна. На чарзе адкрыццё яшчэ аднаго аддзялення сувязі ў мікрараёне Альшанка абласнога цэнтра. У пачатку сакавіка ён пачне дзейнічаць па вуліцы Напалеона Орды.**

Як паведаміла **намеснік дырэктара Гродзенскага філіяла прадпрыемства «Белпошта» Святлана МЯКІШ**, усяго на тэрыторыі рэгіёна працуе 383 аддзяленні паштовай сувязі, з якіх большасць — 265 — у сельскай мясцовасці. Для юрыдычных асоб адкрыта 7 бізнес-філіялаў. Новыя аддзяленні будуць аказваць тыя ж паслугі, як і цэнтральныя гарадскія пошты.

Асаблівасцю сталі выпуск і продаж стылізаваных паштовак з відамі старога Гродна, распрацаваных на аснове матэрыялаў Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея. Пакуль такія паштоўкі можна набыць у гарадах, куды часцей прыязджаюць замежныя турысты. З увядзеннем бязвізавага ўезду попыт на сувенірную прадукцыю, у тым ліку і друкаваную, расце.

Святлана Мякіш паведаміла, што гродзенцы актыўна карыстаюцца паштовай сувяззю, удзельнічаюць у папулярным руху «посткросінг». Як правіла, для сваіх карэспандэнцый многія выбіраюць канверты і паштоўкі з выявамі адметных падзей рэгіёна альбо вядомых асоб. Дарэчы, друкаваная прадукцыя з унікальным штэмпелем карыстаецца попытам і ў калекцыянераў. Так, летась прайшоў чарговы фестываль нацыянальных культур. Да гэтай даты нават была ўстаноўлена стылізаваная пад даўніну каваная паштовая скрыня, выдадзены канверт з сімволікай фестывалю. Мае попыт і канверты з вобразамі знакамітых гродзенцаў — Максіма Багдановіча, Элізы Ажэшкі, Льва Бакста, Міхала Агінскага і іншых.

У мінулым годзе самым папулярным адрасатам Гродна стаў прызёр Алімпіяды Іван Ціхан. Для яго была створана абаненцкая скрыня, куды гродзенцы накіравалі больш за 10 тысяч лістоў з пажаданнямі і віншаваннямі. Цяпер уся карэспандэнцыя знаходзіцца ў гродзенскім музеі пошты.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

■ Падрабязнасці

# Сочым за пасылкай праз тэлефон

## Плануецца выпусціць мабільную паштовую праграму

З яе дапамогай карыстальнікі змогуць адсочваць адпраўленні, рабіць плацяжы, выклікаць паштовага кур'ера, паведаміў **генеральны дырэктар Белпошты Уладзімір МАТУСЕВІЧ.**

Кліентам прадпрыемства таксама стануць больш дастуныя паслугі паштаматаў — устройстваў для адпраўкі і атрымання пасылак. Комплексы ўжо тэсціруюцца спецыялістамі. На першым этапе ў Мінску з'явіцца 11 такіх устройстваў. У далейшым плануецца пашырыць сетку паштаматаў да 20.

Сёлета прадпрыемства будзе актыўна ўдзельнічаць у інтэрнэт-гандлі. Уладзімір Матусевіч патлумачыў, што ў хуткім часе яны наладзяць супрацоўніцтва з шэрагам краін СНД, у першую чаргу з Расіяй, каб арганізаваць магчымасць набыцця беларускіх тавараў, у тым ліку непасрэдна на інтэрнэт-пляцоўцы Белпошты.

# Абслужыць на «выдатна»

## Раённы паштальён стала «Чалавекам года Віцебшчыны»




За дасягненне высокіх паказчыкаў у рабоце і падтрымку належнага ўзроўню якасці паслуг у 2016 годзе ў намінацыі «Энергетыка, транспарт, камунікацыі» ганаровае званне «Чалавек года Віцебшчыны» атрымала Жанна Стальмаховіч, паштальён 4 разраду аддзялення сувязі Новая Зара Чашніцкага раённага вузла сувязі Віцебскага філіяла Белпошты.

Жанна Міхайлаўна працуе ў гэтым аддзяленні з 1995 года. Кліенты і калегі ведаюць яе як кваліфікаванага і адказнага работніка, які шмат увагі надае якаснаму абслугоўванню насельніцтва. Жанна Стальмаховіч «хварэе» за вынікі працы ўсяго калектыву Чашніцкага раённага вузла паштовай сувязі, з'яўляецца настаўнікам моладзі, карыстаецца заслужаным аўтарытэтам і павагай, актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці прадпрыемства.

Ганаровае званне «Чалавек года Віцебшчыны» штогод прысвойваюць, каб узнагародзіць людзей за заслугі ў садзейнічанні рэалізацыі сацыяльнай і эканамічнай палітыкі дзяржавы і органаў мясцовага кіравання, забеспячэнні законнасці і правапарадку, за дасягненні ў галіне навукі, адукацыі і культуры, актыўную грамадскую дзейнасць. 100 найлепшых прадстаўнікоў рэгіёна атрымліваюць дыпломы лаўрэатаў і грашовую прэмію. Акрамя таго, білборды з іх фатаграфіямі на працягу года ўпрыгожваюць населеныя пункты вобласці.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*